**УДК 94(477.74):351.853**

# РЭАЛІЗАЦЫЯ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПАЛІТЫКІ ЗАХАВАННЯ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ ПОЛАЦКА НА ПРЫКЛАДЗЕ КОМПЛЕКСНАЙ ДОЎГАТЭРМІНОВАЙ ПРАГРАМЫ РАЗВІЦЦЯ г. ПОЛАЦКА І НАЦЫЯНАЛЬНАГА ПОЛАЦКАГА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАГА МУЗЕЯ-ЗАПАВЕДНІКА (2000 – 2005 гг.)

***К. В. АНДРЭЙЧЫК***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Разглядаюцца рэалізацыя і асноўныя дасягненні рэгіянальнай праграмы развіцця г. Полацка і Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Мэта праграмы – стварэнне спрыяльных умоў для ўмацавання і выкарыстання сацыякультурнага і турыстычнага патэнцыяла г. Полацка і Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка, развіццё гарадской інфраструктуры і рэнавацыя тэрыторыі гістарычнага цэнтра населенага пункта, эфектыўнае выкарыстанне нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей.*

***Ключавыя словы:*** *органы ўлады, заканадаўства, дзяржаўнае рэгуляванне, гісторыка-культурныя каштоўнасці, праграма развіцця г. Полацка і Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.*

**Уводзіны.** Інструментам рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі, умовай эфектыўнага кіравання і стабільнага развіцця тэрыторый з'яўляецца пастаноўка органамі ўлады арыенціраў-праграм рэгіянальнага развіцця. Мэтавыя праграмы закліканы ўздзейнічаць на сацыяльна-эканамічную, культурную дзейнасць тэрытарыяльна-адміністрацыйных адзінак краіны.

Увага з боку дзяржаўнай улады да развіцця культурнага патэнцыяла і захавання гістарычнай спадчыны аднаго з самых старажытных гарадоў краіны – Полацка – была падкрэслена яшчэ на пачатку 1990-х гг. Праз зацверджанне Пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 16.07.1990 г. № 158 "Аб Полацкім гісторыка-культурным запаведніку" шэраг архітэктурных помнікаў былі ўнесены ў ахоўную зону, тэрыторыю рэгулявання забудовы і ахоўнага прыроднага ландшафту Полацкага гісторыка-культурнага запаведніка. У 1993 г. Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь "Аб мерах па далейшым развіцці горада Полацка і захаванні яго культурна-гістарычнай спадчыны" Віцебскаму аблвыканкаму было дадзена даручэнне аб рэалізацыі шэрагу мерапрыемстваў у азначаным накірунку. Для прыкладу, ставілася пытанне аб вызваленні карпусоў былога езуіцкага калегіума, які лічыўся на балансе Беларускай вайсковай акругі з прыстасаваннем пад сацыякультрныя патрэбы горада [1]. Наступным шырокамаштабным крокам да ўмацавання і выкарыстання сацыякультурнага і турыстычнага патэнцыяла горада стала распрацоўка і рэалізацыя Комплекснай доўгатэрміновай праграмы развіцця г. Полацка і Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка (далей – Праграма). Праграма прадугледжвала рэалізацыю сукупнасці мерапрыемстваў, накіраваных на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы соцыякультурнага сектара, добраўпарадкаванне і эстэтызацыю населенага пункта, музеефікацыю культурнай прасторы горада, папулярызацыю ведаў аб багатай гістарычнай спадчыне Полацка.

**Асноўная частка.** Напачатку лютага 2000 г. ад старшыні Полацкага гарвыканкама, У.С. Тачылы, паступіла прапанова да намесніка прэм'ер-міністра, В.І. Дражына, аб садзейнічанні развіццю культурнага і турыстычнага патэнцыяла г. Полацка. Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь сумесна з зацікаўленымі ведамствамі ў лютым 2000 г. быў распрацаваны праект Комплекснай доўгатэрміновай праграмы развіцця г. Полацка і Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Дакумент быў прадстаўлены А.Г. Лукашэнка, які прапанову ўхваліў і даручыў прыняць небходныя меры па выкананні праграмы (даручэнне ад 16.02.2000 г. № 10/124-122). 08 верасня 2000 г. адбылася нарада ў прэм'ер-міністра У.У. Ярмошына, на якой за Міністэрствамі і ведамствамі былі замацаваны канкрэтныя абавязкі па выкананні праграмы. Адказнымі былі прызначаны: Міністэрства культуры, Міністэрства аховы прыроды і навакольнага асяроддзя, Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, Міністэрства абароны, Міністэрства спорту і турызму, Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія Рэспублікі Беларусь, Дзяржкамдрук, Віцебскі аблвыканкам, Полацкі гарвыканкам, Беларускі дзяржаўны канцэрн па нафтахіміі, Полацкае вытворчае аб'яднанне "Шкловалакно". Ход рэалізацыі праграмы знаходзіўся пад кантролем Савета Міністраў. Рэалізацыя асноўнага аб'ёму работ па ўсіх накірунках была прымеркавана на 2001 г. [2, с. 4].

Комплексная доўгатэрміновая праграма развіцця г. Полацка прадугледжвала рэалізацыю сукупнасці мерапрыемстваў, накіраваных на добраўпарадкаванне і эстэтызацыю функцыянальна-прасторавай структуры населенага пункта, музеефікацыю гістарычнай часткі горада, стварэнне камфортных умоў для жыцця гараджан. Асобая ўвага надавалася развіццю матэрыяльна-тэхнічнай базы сацыякультурнай сфе-

ры пасродкам будаўніцтва аб’ектаў (працяг работ па будаўніцтву палiклiнiкi, пачатак будаўніцтва сярэдняй школы № 4, узвядзенне прыбудовы да мастацкай школы); інжынерных камунікацый (пракладка дзвюхнітачнага дзюкера праз р. Палату, будаўніцтва водазабора “Заазер’е”); рэканструкцыі матэрыяльных нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей (працяг работ на карпусах былога езуіцкага калегіума, былой воданапорнай вежы, аднаўленне фрэскавага роспісу Спаса-Праабражэнскай царквы); прыстасавання матэрыяльных нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей пад патрэбы Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка (размяшчэнне ў воданапорнай вежы экспазіцыі экалагічнага музея, рэстаўрацыі дома № 46 па вул. Леніна (Ніжне-Пакроўская) для адкрыцця Дзіцячага музея). Мерапрыемствы па добраўпарадкаванні вяліся суадносна з планам па азеляненні і добраўпарадкаванні гарадскіх тэрыторый на 2001 – 2002 гг., зацверджаным Полацкім гарвыканкамам [2, с. 65].

Для кантролю за тэрмінам і якасцю выканання Праграмы, Камісія Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе стала ініцыятарам правядзення выязднога паседжання на ўзроўні ўрада і іншых зацікаўленых ведамстваў. Мерапрыемства было прызначана на верасень 2001 г., праграма ўключала наведванне аб’ектаў, музеяў і жаночага Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра [2, с. 38].

Праблемным пытаннем стала арганізацыя механізму перадачы з баланса Міністэрства абароны часткі будынкаў былога езуіцкага калегіума пад патрэбы Міністэрства адукацыі. Першачаргова патрабавалася перадыслацыраваць ваенны шпіталь ў Баравуху-3 і падключыць будынкі да гарадскіх інжынерных сетак. На гэтыя мэты Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмай са сродкаў рэспубліканскага бюджэту ў 2001 г. было прадугледжана выдзяленне 14 млн. руб. На праектныя работы па рэканструкцыі будынкаў былога ваеннага гарадка Баравуха-3 планавалася выдаткаваць 16,5 млн. руб., аднак сродкі з дзяржбюджэту не вылучаліся [2, с. 41].

На пачатковым этапе рэалізацыі праграмы развіцця г. Полацка Міністэрствам жыллёва-камунальнай гаспадаркі актыўна вялося будаўніцтва водазабора “Заазер'е”. Паскарэнню работ садзейнічала своечасовае фінансаванне ў памеры 500 млн. руб., дзякуючы чаму быў уведзены ў эксплуатацыю дзвюхнітачны дзюкер праз р. Палату [2, с. 13].

Аднаўленне нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей прадугледжвала рэстаўрацыю помнікаў архітэктуры і фрэскавага жывапісу. Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеем-запаведнікам былі заключаны дамовы з “Белінфармрэстаўрацыя” на распрацоўку праектна-каштарыснай дакументацыі па капітальным рамонце і рэстаўрацыі Сафійскага сабора, краязнаўчага музея і Дома Пятра I. На гэтыя мэты было выдзелена ў 2001 г. 97 млн. руб. [4, с. 34].

На рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы па аб'екце “Езуіцкі калегіум корпус “А” Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмай на 2001 г. было выдзелена 300,8 млн. руб. Выканаўцам работ з’яўлялася прадпрыемства “Полацкрэстаўрацыя”, якім вяліся агульнабудаўнічыя работы корпуса “А”: быў змантаваны нулявы цыкл, выведзены сцены першага і другога паверхаў. Тэрмін здачы аб’екта запаведніку прызначаўся на трэці квартал 2001 г., на год было выдзелена 290 млн. руб., з якіх асвоілі 59,8 млн. руб. У будынку планавалася размясціць мастацкую галерэю, дзе на 2002 г. было прымеркавана адкрыццё экспазіцыі. Рэспубліканскай праграмай рэстаўрацыйных работ былі прадугледжаны бюджэтныя асігнаванні на суму 300,8 млн. руб., аднак бюджэтныя грошы так і не паступалі па стане на сакавік 2001 г. Працы на езуіцкім калегіуме прыпыняліся або замаруджваліся. У выніку адсутнасці фінансавання на прадпрыемстве “Полацкрэстаўрацыя” былі выкарыстаны ўсе абаротныя сродкі, утварылася запазычанасць за спажыванне матэрыяльна-энергетычных рэсурсаў, адсутнічала магчымасць выплаты работнікам заработнай платы. На 2001 г. запазычанасць па бюджэце складала 7 млн. руб., 5 млн. руб. – запазычанасць па цеплаэнергарэсурсах і 2 млн. руб. – за пастаўленыя будаўнічыя матэрыялы. Акрамя таго, “Полацкрэстаўрацыя” мела нізкі ўзровень матэрыяльна-тэхнічнай базы [2, с. 24].

Згодна са справаздачай Міністэрства фінансаў у 2001 г. Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмай Камітэту па рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў пры Міністэрстве культуры на рэстаўрацыю музея-запаведніка планавалася вылучыць 320,3 млн. руб. (на калегіум – 300,8 млн. руб., на Спаса-Праабражэнскую царкву – 19,5 млн. руб., аднак згодна з паказчыкамі бюджэту на 2001 г. капітальныя ўкладанні былі скарочаныя на 11,3% з мэтай накіравання вызваленых сродкаў у стабілізацыйны фонд павышэння заработнай платы работнікам бюджэтнай сферы. У 2001 г. паступіла 71,54 млн. руб. на аднаўленчыя работы (58,4 млн. руб. і 12,6 млн.руб., адпаведна). Кошт работ па карэкціроўцы генплана горада склаў 11 млн. руб., на работы па рэстаўрацыі дома № 46 па вул. Леніна (Ніжне-Пакроўская) для адкрыцця Дзіцячага музея было выдзелена 100 млн. руб. Па аб’екце “Езуіцкі калегіум” адначасова з рэстаўрацыяй корпуса “А” вялася падрыхтоўка праектна-каштарыснай дакументацыі для рэстаўрацыі карпусоў “В” і “Б”. Корпус “В” планавалася прыстасаваць пад экспазіцыі музея гісторыі і археалогіі горада. Аб’ём фінансавання навукова-даследчых работ склаў 4,1 млн. руб. Была заключана дамова на распрацоўку навукова-праектнай дакументацыі па рэстаўрацыі Спаса-Праабражэнскай царквы на суму 6,7 млн. руб. На 2001 г. было праведзена інжынернае даследаванне канструкцый помніка, коштам у 1,1 млн. руб., работы па рэстаўрацыі фрэскавага роспісу Спаса – Праабражэнскай царквы, на якія было затрачана 12,6 млн. руб. [2, с. 31].

Па факту праверак тэрмінаў і якасці рэалізацыі праграмы Міністэрствам культуры было адзначана, што асноўным стрымліваючым фактарам у выкананні запланаваных рэстаўрацыйных работ стала "…несвоечасовае праходжанне фінансавых сродкаў праз казначэйствы, што не забяспечыла ўзаемаразлікі па выкананых работах, авансаванне набыцця матэрыялаў" [2, с. 31].

Важным накірункам Праграмы стала рэалізацыя мерапрыемстваў па развіцці Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Статус "нацыянальны" Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік атрымаў 28 ліпеня 2000 г. у адпаведнсці з Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 1128. Па стане на 2000 г. у запаведніку функцыянавала 8 музеяў, абслугоўвалася 200 тыс. наведвальнікаў за год, 100 помнікаў архітэктуры мелі статус гісторыка-культурнай каштоўнасці [6, с. 76].

Пачынаючы з 1999 г., Нацыянальнаму Полацкаму гісторыка-культурнаму музею-запаведніку штогод аказвалася сістэматычная фінансавая падтрымка Міністэрствам культуры ў пытаннях набыцця музейных прадметаў, твораў выяўленчага мастацтва. У 2000 г. было выдзелена 2,8 млн. руб. У першым паўгоддзі 2001 г. былі набыты калекцыі кніг, прадметы выяўленчага мастацтва, унікальныя рарытэтныя тканіны для рэканструкцыі нацыянальнага рэгіянальнага касцюма на суму 4,9 млн. руб.

Упраўленне культуры Віцебскага аблвыканкама 16 лютага 2001 г. прадставіла на камісію фонда Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтваў гранты: "Рэстаўрацыя калекцыі абразоў з фондаў НПГКМЗ", "Праект комплекснай навукова-інфармацыйнай сістэмы НПГКМЗ". Запаведнікам былі падрыхтаваныя кампакт-дыскі "Канцэрты арганнай музыкі салісткі Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка Ксеніі Пагарэлай". За сродкі гранта, атрыманага з фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва, былі набыты камп'ютар, ксеракс, відэакамера, творы мастацтва. За ўласныя сродкі музеем-запаведнікам былі выдадзены памятныя календары "Музей-бібліятэка Сімяона Полацкага", "75 год краязнаўчаму музею", буклет "Сафійскі сабор".

Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя фінансавала работы па рэстаўрацыі воданапорнай вежы з мэтай прыстасавання пад патрэбы музея экалогіі. У 2001 г. было прадугледжана вылучыць з мясцовага бюджэтнага фонду аховы прыроды на завяршэнне рэканструкцыі воданапорнай вежы 20,0 млн. руб. Па стане на 25.06.2001 г. дагавор на фінансаванне вышэйзгаданых работ заключаны не быў па прычыне адсутнасці ў падрадчыка ліцэнзіі на выкананне адпаведных работ.

Заказчыкам выступаў музей-запаведнік, распарадчыкам быў мясцовы Фонд аховы прыроды. На 2001 г. год планавалася вылучыць 5 млн. руб. з рэспубліканскага бюджэту на фарміраванне экпазіцыі і закупку абсталявання [2, с. 16].

Перад Міністэрствам спорта і турызма была пастаўлена задача выдання паліграфічнай прадукцыі рэкламнага, навукова-папулярнага кшталту, падрыхтоўкі метадычных распрацовак тэматычных экскурсійных тэкстаў, зацвярджэння экскурсійных і турыстычных нітак маршрутаў. Метадычная праца была ўскладзена на грамадскае аб'яднанне "Беларуская асацыяцыя экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў". З мэтай папулярызацыі ведаў аб гісторыка-культурнай спадчыне Полацка Міністэрствам спорту і турызму было прафінансавана выданне турыстычнага рэкламнага альбома аб Полацку з апісаннем прыгранічных маршрутаў на беларускай і замежных мовах, былі распрацаваны турыстычныя маршруты як для замежных турыстаў так і для айчыных экскурсантаў на тэму: "Барока і класіцызм у шэдэўрах беларускай архітэктуры", "Адраджэнне народных рамёстваў і промыслаў", "У госці да Я. Драздовіча", "Жыццё і побыт невялікіх гарадоў". Метадычным сектарам "Полацкага бюро падарожжаў і экскурсій" быў падрыхтаваны дапоўнены тэкст абзорнай шматпланавай гарадской экскурсіі на тэму: "Полацк – старажытны горад Беларусі і ўсходніх славян" (аўтар-складальнік І. І. Каліноўскі) [3, с. 59].

Справу папулярызацыі ведаў аб гісторыка-культурнай спадчыне Полацка працягнула Белтэлерадыёкампанія і Дзяржкрамдрук. Апошнім былі падрыхтаваны: прызентацыйны буклет "Архітэктурныя помнікі Полацка", камплект паштовак "Музей беларускага кнігадрукавання", "Полацк на паштоўках пачатку XX ст.", фотаальбом "Полацк". Белтэлерадыёкампанія на пачатку 2001 г. выпусціла ў прамы эфір цыкл тэлеперадач, прысвечаных сацыяльна-эканамічнау развіццю Полацка, культурнай прасторы горада, а таксама тэлезамалёўкі на тэмы: "Святы ў Полацку", "Аб горадзе і аб сабе", "Полацк-гістарычны", "Рэканструкцыя гістарычнага цэнтра Полацка", "Народная творчасць полацкай зямлі" і інш. Беларускае радыё ў сваіх праграмах вяло рубрыку "На хвалі часу", "Зямля пад белымі крыламі". Да эфіру было падрыхтавана больш за 100 радыё і тэлесюжэтаў. На радыё са студзеня па чэрвень 2001 г. у інфармацыйных праграмах "Радыёфакт", "Постфактум", "Панарама" а таксама ў ранішніх, дзённых, вячэрніх выпусках навін вялася рубрыка на тэму сацыяльна-эканамічнага развіцця горада і гісторыка-культурнай спадчыны Полацка. 23 студзеня 2001 г. у вячэрняй праграме "Пастфактум" была асветлена сустрэча рэктара Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Э. М. Бабенка са старшынёй Віцебскага аблвыканкама [2, с. 19].

Рашэннем Савета Фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва Нацыянальнаму Полацкаму гісторыка-культурнаму музею-запаведніку быў выдзелены грант у памеры 8,5 млн. руб. для стварэння экспазіцыі ў Мастацкай галерэі і 2 млн. руб на закупку карцін. Былі пачаты праектные работы па распрацоўцы плана рэгенерацыі г. Полацка і тэрыторыі музея-запаведніка да 2001 г.

У 2000 г. пры ўдзеле Полацкага гарвыканкама было створана ЗАТ “Скарб”, якое атрымала лецэнзію на ажыццяўленне турыстычнай дзейнасці. Творчым калектывам супрацоўнікаў музея-запаведніка быў сабраны неабходны матэрыял, і на пасяджэнні навукова-метадычнага савета была зацверджана тэматыка турыстычных маршрутаў “Барока і класіцызм у школе беларускай архітэктуры” (Полацк – Лепель – Браслаў – Полацк), “Па дарогах Язэпа Драздовіча” (Полацк – Браслаў – Полацк), “Адраджэнне народных рамёстваў Паазер'я” (Полацк – Лепель – Браслаў – Полацк). У раёне Кургана плнавалася стварыць турыстычны маршрут, які ўключаў музей Вялікай Айчыннай вайны і музей-кватэру З. М. Тусналобавай-Марчанка. Адпаведная ўвага была нададзена фарміраванню і прасоўванню брэнда “Полацк”. Сімвал горада – карабель-парруснік – стаў упрыгожваць прадукцыю прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці [2, с. 64].

Рэдакцыя грамадскіх і сацыяльна-эканамічных праграм Беларускага Радыё трымала ў пастаянным полі зроку ход выканання Комплекснай доўгатэрміновай праграмы развіцця Полацка і НПГКМЗ на 2000 – 2005 гг. Праблемныя бакі аднаўлення помнікаў архітэктуры разгладаліся ў тэлепраграме “Спадчына” (выпуск ад 12 красавіка 2001 г.). Асаблівая ўвага надавалася захаванню гісторыка-культурнай спадчыны Полацка. На гэтую тэму былі падрыхтаваныя сюжэты пра гісторыю Полацка, музей кнігадрукавання, музей ткацтва, краязнаўчы музей. Таксама ў перадачы прагучаў рэпартаж аб завяршэнні работ на корпусе “А” езуіцкага калегіума. Асабліва актуальнымі былі інфармацыйныя блокі, прысвечаныя неабходнасці развіцця турыстычнай інфраструктуры: будаўніцтва дарог, гасцініц, пунктаў харчавання [5, с. 23].

Тэма гісторыка-культурнай спадчыны Полацка была адлюстравана ў працы радыё і тэлебачаня Віцебскага абласнога тэлерадыёаб’яднання. На абласным радыё і “РадыёВіцебск” у 2001 г. выйшла ў эфір больш за 20 інфармацыйных паведамленняў і радыёсюжэтаў, прысвечаных навуковаму і культурнаму жыццю горада (фестывалям, выставам, навукова-практычным канферэнцыям, семінарам). На абласным тэлебачанні, у інфармацыйнай праграме “Віцебскі Веснік”, выйшла ў эфір каля 20 відэасюжэтаў, асобныя тэмы якіх перараслі ў перадачы: “Міжнародны фестываль арганнай музыкі "Званы Сафіі"”, “Міжнародны фестываль камернай музыкі”, “Вытокі” (аб урачыстасцях да дня памяці Ефрасінні Полацкай, экалагічных праблемах, дзеячах культуры мінулага і сучаснасці). Рэпартажы знаёмілі гледачоў з традыцыйным Пагашэнне марак з выявай Ефрасінні Полацкай. Падзеі, якія праводзіліся ў канцэртнай зале Сафійскага сабора, штомесяц асвятляліся ў спецыяльнай праграме “Культурная палітра Рэспублікі” (пятнічныя і суботнія выпускі “Постфактуму”), асобна распавядалася аб імпрэзах, прысвечаных XV Міжнароднаму фестывалю старадаўняй і сучаснай музыкі, які праходзіў у Сафійскім саборы, бралася інтэрв’ю з загадчыкам канцэртным аддзелам Л. Емяльянавай. У маі – чэрвені 2001 г. слухачы даведаліся аб асвячэнні Патрыярхам Маскоўскім і ўсяе Русі спецыяльнага футарала да крыжа Еўфрасінні Полацкай, аб пяцідзённым пленэры юных мастакоў, тэмай якога стала 500-годдзе архітэктурнага стылю барока. 5 чэрвеня 2001 г. прагучала інфармацыя аб наведванні Філарэтам Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра [6, с.80].

Рэдактары Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі падрыхтавалі перадачы-інтэрв’ю са старшынёй полацкага гарвыканкама У. С. Тачылай, прысвечаныя сацыяльнай і эканамічнай аснове выканання Комплекснай доўгатэрміновай праграмы развіцця г. Полацка і Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Быў зняты сюжэт аб Полацкім езуіцкім калегіуме, дзе прагучалі крытычныя водгукі ў бок прадпрыемства “Полацкрэстаўрацыя”. Адбылася гутарка з дырэктарам музея-запаведніка Н. Н. Ільніцкім і дырэктарам музея традыцыйнага ткацтва Н. У. Філатавай [2, с. 67].

За тэрмін дзеяння Праграмы былі ўсталяваны помнікі выдатным дзеячам мінулага Полацкай зямлі. Прызнанне і развіццё гарадскімі ўладамі патэнцыяла Полацка ў турыстычным плане знайшло сваё адлюстраванне ў мастацка-эстэтычным аздабленні гарадской прасторы і турыстычнага ядра горада мастацкімі скультурамі. Праспект Ф. Скарыны (былы праспект К. Маркса) стаў галоўнай турыстычнай воссю гістарычнага цэнтра. Па задумцы скульптура як мастацка-эстэтычны складнік гарадской прасторы, з’яўляючыся своеасаблівым арыенцірам у ансамбле горада, павінна была ўносіць сэнсавыя акцэнты ў адчуванне яго атмасферы. Жадаючы падкрэсліць культурна-асветніцкія традыцыі полацкай мінуўшчыны, у верасні 2003 г. у гарадскім скверы быў усталяваны помнік асветніку XVII ст. Сімяону Полацкаму (скульптар А. Фінскі, архітэктары Н. Царык і Г. Фёдараў). 7 верасня 2003 г. быў святочна адкрыты помнік літары “Ў” (аўтар І. Куржалаў). На пастаменце зроблены надпіс – паэтычная метафара вядомага беларускага паэта, Рыгора Бородуліна: “Ад Еўфрасінні, ад Скарыны, ад Полацка пачаўся свет...” У 2004 г. сустрэў першых наведвальнікаў Дзіцячы музей. Канцэпцыяй музея быў прапанаваны новы інтэрактыўны падыход да прэзентацыі прадметаў культуры і мастацтва. Майстар-класы, віктарыны, квэсты сталі візітнай карткай установы. 3 верасня 2005 г. з нагоды правядзення экалагічнага фестывалю ля будынка музея былі ўсталяваныя скульптурныя кампазіцыі “Дзяўчынка з сонечным гадзіннікам” і “Шкаляр з гадзіннікам”, аўтара П. Вайніцкага [4, с.67-69].

Даручэннем Савету Міністраў аб ходзе выканання Праграмы ўстановам адукацыі было рэкамендавана наведваць гістарычныя і культурныя аб’екты Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка з мэтай выхавання ў падрастаючага пакалення патрытызму і гонару за малую Радзіму.

**Высновы.** Такім чынам, у ходзе рэалізацыі Комплекснай доўгатэрміновай праграмы развіцця г. Полацка і Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка быў выкананы шэраг пастаўленых задач: будаўніцтва аб’ектаў сацыяльна-культурнай сферы, добраўпарадкаванне тэрыторыі, рэстаўрацыя і прыстасаванне пад патрэбы грамадства матэрыяльных нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей. Былў зданы ў эксплуатацыю корпус “А” былога езуіцкага калегіума, дзе адкрылася мастацкая галерэя, астатнія карпусы былі канчаткова перададзеныя на баланс Міністэрства адукацыі з прыстасаваннем памяшканняў пад вучэбныя і лабараторныя аўдыторыі, завершана рэстаўрацыя будынка па вул. Ніжне-Пакроўскай, 46, у якім размясціўся дзіцячы музей.

У сувязі з недастатковым фінансаваннем некаторыя пазіцыі Праграмы былі выкананы не цалкам, тэрміны завяршэння работ былі падоўжаны. Так, рэстаўрацыя помніка прамысловай архітэктуры – воданапорнай вежы – з прыстасаваннем пад музей экалогіі было замаруджана. Урачыстасці адбыліся толькі ў 2006 г. За перыяд рэалізацыі праграмы былі падрыхтаваны экскурсійныя маршруты, устаноўлены помнік знакамітаму полацкаму дзеячу, Сімяону Полацкаму, а таксама букве “Ў”. У 2000 г. Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік атрымаў статус “нацыянальны”. У 2004 г. адчыніўся дзіцячы музей, у 2005 г. Нацыянальны Полацкі гіторыка-культурны музей-запаведнік аб’яднаў 11 музеяў. Паралельна з ходам рэалізацыі Праграмы былі прыняты “Нацыянальная праграма развіцця турызму Рэспублікі Беларусь на 2001 – 2005 гг. і пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 23.07. 2001 г. № 1085 “Аб першачарговых мерах па захаванні і адраджэнні гістарычных цэнтраў гарадоў Беларусі”, якія акрэслівалі арыенціры ў развіцці турызму і зберажэнні гісторыка-культурнай спадчыны.

## ЛІТАРАТУРА


1. Андрэйчык, К. В. Культурна-адукацыйная прастора Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта ў справе захавання асветніцкіх традыцый / К. В. Андрэйчык // Выш. шк. – 2017. – № 5. – С. 26 – 31.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 7. Воп. 16. Спр. 4756.
3. НАРБ. – Ф.7. Воп. 16. Спр. 4754.
4. НАРБ. – Ф.7. Воп. 12. Спр. 4761.
5. НАРБ. – Ф. 968. Воп. 1. Спр.4049
6. Архіў Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. – Ф.1. Воп. 1. Спр. 16.


*Паступіў 07.10.2019*

## IMPLEMENTATION OF THE STATE POLICY OF PRESERVING THE HISTORICAL AND CULTURAL HERITAGE OF POLOTSK ON THE EXAMPLE OF A COMPREHENSIVE LONG-TERM DEVELOPMENT PROGRAM OF POLOTSK AND THE NATIONAL POLOTSK HISTORICAL AND CULTURAL MUSEUM-RESERVE (2000-2005)"

***K. ANDREICHYK***

*The article considers the progress of implementation, the main achievements of the regional development program of Polotsk and the national Polotsk historical and cultural Museum-reserve. The purpose of the program is to create favorable conditions for strengthening and using the socio-cultural and tourist potential of Polotsk and the national Polotsk historical and cultural Museum-reserve, development of urban infrastructure and renovation of the territory of the historical center of the settlement, effective use of immovable material historical and cultural values.*

***Keywords:*** *authorities, legislation, government regulation, historical and cultural values, development program of Polotsk and national Polotsk historical and cultural museum-reserve.*